**Міхась Болсун**



## ГАРМОНІК ДЛЯ СЫНА

Гумарэска

Павел Пылёк хацеў мець сына. Нараджаліся ж дочкі. Іх у сям'і было ўжо трое. У калгасным будбрыгадзе, дзе ён працаваў, не давалі праходу. Найчасцей падтрунівваў рыжы цясляр Цішка Стругальчык:

— Здаецца, і не хілы ты, сусед, майстравы. Падмурак пад дом зробіш – толькі глядзець. А вось закласці аснову пад сына таленту не хапае. Мяне папрасі, я ў гэтай справе правераны практык. Трое "жэўжыкаў" па хаце бегаюць.

— І ўсе рыжыя, як сам, — агрызаўся Павел.

— Цемра ты вясковая, — насядаў Стругальчык. — Чым рыжэй — тым даражэй. За свайго Кузьму я заўжды вазьму, а ты сваю Марынку павадзі па рынку. А пашанцуе ім выйсці замуж — паляціць тваё прозвішча кату пад хвост. Ты лепш скажы, чаму ў тваёй Таццяны мяшок на дзяўчынак развязаўся. Не ведаеш? Адказваю: народнымі прыкметамі грэбуеш. Перад тым, як спаць з жонкай, пакладзі пад падушку прадмет мужчынскага роду: рубанак, малаток, сцізорык ці яшчэ што. Як ніць, сын будзе.

— Ты яшчэ параіш чалавеку плуг пад ложак зацягнуць, — рагатнуў старэйшы ў брыгадзе Алесь.

— А што? — падхапіў Цішка. — Гэта ўжо на ўсе сто працэнтаў гарантыя.

Павел мужна пераносіў кпіны. Аднак, калі ў чарговы раз завёз цяжарную жонку ў бальніцу, заявіў:

— Народзіцца сын, адразу ж гармонік куплю. Падарунак будзе на ўсё жыццё.

На другі дзень брыгада ставіла кроквы на новым доме. Напярэдадні выдалі зарплату і настрой у мужыкоў быў прыўзняты. Працавалі шчыра, спрытна. Нават не заўважылі, як да іх падышоў вядомы на вёсцы пустаслоў Сцяпан Бурбалка.

— Хведаравіч, — гукнуў ён брыгадзіра, ды так, каб усе чулі.

— Няхораша атрымліваецца. Сёння Пыльку трэба гарэлку піць, а ты яго на верхатуру загнаў. Як-ніяк, у чалавека сын нарадзіўся. Паштарка ў раддом званіла, пра нявестку распытвала, а заадно і Пыльчыхай пацікавілася. Сказалі, што тая не дзіцё, а волата "вытрасла".

Паўла нібы ветрам здзьмула з лесвіцы. Вочы засвяціліся радасцю, твар расплыўся ў шырокай усмешцы.

— А вы тыцкалі: бракароб, бракароб, — Пылёк з размаху ўляпіў сякеру ў бервяно, дастаў з кішэні грошы. — Вы, значыць, тут без мяне напрыканцы за сына па келіху прапусціце, а я — у райцэнтр, гармонік купляць.

Павел не стаў чакаць аўтобуса, пашыбаваў па лясной дарожцы ў мястэчка. У кустоўі цынькалі сініцы, недзе блізка на сасне барабаніў дзяцел, а ўдалечыні камусьці адлічвала гады зязюля. На душы было лёгка, узнёсла. Галасы лесу здаваліся Пыльку найлепшай музыкай, якую ён калі-небудзь чуў.




У райцэнтры Павел купіў для жонкі прадуктаў і першы раз у жыцці букет кветак. Затым у магазіне "Культтавары" доўга і прыдзірліва выбіраў гармонік, хоць ведаў і ўмеў граць толькі "Амурскія хвалі".

У радзільным аддзяленні бальніцы ён пастукаў у зачыненае акенца. Адкрыла жанчына ў белым халаце.

— Калі ласка, паклічце Таццяну з Залесся, — папрасіў, стрымліваючы хваляванне, Павел.

Яшчэ здалёк Павел заўважыў жонку ў бальнічным халаце. Калі яна падышла, не даў раскрыць ёй рот:

— Віншую, даражэнькая. Малайчына ты ў мяне, спраўдзіла надзею. Вось табе кветкі. Я пакуль па лесе ішоў, нават імя выбраў. Славікам назавем, няхай славу нашага роду множыць.

— Што з табой, Павел? — здзіўлена глянула Таццяна на мужа. — Які Славік? Дачка ў нас, Светкай назавем. Беленькая такая, уся ў цябе. Ты што, не згодзен?

На разгубленым твары Паўла застыла кіслая грымаса. Ён некалькі хвілін здранцвела стаяў ля акенца і, здаецца, не заўважаў жонку. Потым крутануўся, незнарок зачапіў рукой раменьчык на гармоніку. Мех папоўз з пляча ўніз, і ў калідоры раздаліся несуладныя гукі басоў.

## САХВЕЯ НЕ ЗБЯДНЕЕ

Гумарэска

Коні разбрыліся па вячэрнім лузе і апетытна скублі атаву. Дзядзька Панас, крыху маладзейшы за яго Кузьма і юнак Валодзя абляпілі цяпельца. Апошні высыпаў з паркалёвай торбачкі з дзесятак бульбін, каб пакласці ў прысак.

— Хлопец, — апярэдзіў Валодзю Панас, — сёння тваё меню адмяняецца. Я падоечы ехаў тут верхам на кані. Глянуў на Сахвеін агарод і ахнуў. Кукуруза там — зялёны гай. Кіёўкі таўшчынёй з руку будуць, і доўгія, бы вось гэта пугаўё. Так што, сынок, не палічы за клопат, скокні, зламай некалькі. Сахвея не збяднее. Колькі ёй са старым патрэбна таго прадукту.

На здзіўленне абодвух, Валодзя ахвотна прыняў прапанову і знік у цемры. Панас жа пачаў абходжваць цяпельца. Раз-пораз падкідваў сухі вербалоз, варушыў прысак.

— Аднак, брат, цябе толькі па смерць пасылаць, пайшоў, як патануў, - папракнуў юнака Панас, калі той вярнуўся.

— Дык цемра ж, хоць вока выкалі, — буркнуў Валодзя і, нібы той фокуснік, пачаў вытрасаць з-за пазухі вялікія, зялёныя кіёўкі.

— А не перастараўся? — глянуўшы на ладную кучку кукурузы, спытаў Кузьма.

— Не сёння дык заўтра спатрэбіцца. У куст пакладу — заўжды знайду, — апраўдаўся Валодзя.

Пекчы кукурузу ўзяўся Панас.

Елі ўсе апетытна. Дзядзька Панас так увішна вадзіў зубамі па жоўтых радках зярнят, што здавалася: чалавек не падсілкоўваецца, а на гуслях грае. Пры гэтым яшчэ паспяваў нахвальваць і Сахвею.

– Якая дбайная гаспадыня! За што не возьмецца – у руках гарыць. Не тое, што мая кабета. Лета корпалася на агародзе, а толку – ніякага. Казаў жа вясной: давай лепш лішні корч бульбы вырасцім. Дзе там? Няхай, кажа, будуць і градкі, як у людзей. Ды каб жа як у людзей было, а то не грады – курам на смех.

Раніцай, прыгнаўшы табун у канюшню, Панас пашкандыбаў дахаты. Яшчэ на падворку да яго данесліся зычныя праклёны жонкі Хвядоры ў нечы адрас:

– Каб табе жывот разарвала, сквапнік ненажэрны! Гэта ж трэба так агарод спустошыць! Што ж такое дзеецца, людцы добрыя!

Панас выйшаў на агарод, агледзеў кукурузную градку. На вільготнай мяжы ўбачыў адбітак мужчынскіх ботаў. Якраз як Валодзевы.

– Вось жа падшыванец, так аб'ягорыў старога!